# ЧАЛАВЕК І РАДЗІМА

Радзіма — гэта і сонца ў цябе над галавою, і паветра, якім дыхаем, гэта і вернасць твайго сябра, і мова, якую даў табе народ, і песня, што засталася ад прадзедаў.

*Уладзімір Караткевіч*



Пры вывучэнні твораў раздзела:

✓ **будзем знаходзіць** радкі, якія паказваюць адносіны герояў твораў да Радзімы і яе гісторыі;

✓ **будзем вучыцца** прагназаваць змест твора па загалоўку; вызначаць тэму і асноўную думку твораў; знаходзіць у вершах вобразныя словы і выразы, тлумачыць іх значэнне і ролю.

**Варта задумацца.** Чаму сучасны вучань павінен цікавіцца і вывучаць гістарычнае мінулае сваёй Радзімы і роднага краю?



Правообладатель Академия образования

## У свеце прыгожага

1. Разгледзьце фотаздымак беларускага пейзажу.



2. Адкажыце на пытанні.

1) Што вы ўбачылі на гэтым фотаздымку?

2) Якую назву і чаму яму можна даць? Патлумачце.

3) Па якіх прыкметах можна сцвярджаць, што на фотаздымку лета?

4) Як выглядае неба? Апішыце луг, поле, возера.

5) Якія думкі і пачуцці выклікаў у вас гэты фотаздымак?

*Пафантазіруйце.* Прачытайце загаловак верша. Аб чым можа ісці гаворка ў творы?

## Люблю цябе, Белая Русь

*Уладзімір Карызна*



Жытнёвае поле, лясы і азёры,
Крынічанька ў лузе і ў небе жаўрук...
Услухайся толькі — усё тут гаворыць:
«Люблю цябе, Белая, Белая Русь!»

Ну як не любіць тыя хаты ля гаю,
Ля сініх азёр і палёў залатых,
Дзе хлебам і соллю сяброў сустракаюць
І з песняй праводзяць, як родных сваіх!..

Свет помніць і сёння, як ты ваявала,
Што кожны чацвёрты ў зямлі — беларус.
З сынамі Радзімы Маскву адстаяла,
Жыццё адстаяла, о Белая Русь.

Тут трэба ля гэтых азёр нарадзіцца,
І слухаць гаворку, і бачыць зару,
Каб сэрцам і доляй навек прычасціцца
К табе, мая чыстая Белая Русь!

Па апошніх даных, у Вялікай Айчыннай вайне загінуў кожны трэці беларус, былі разбураны амаль усе гарады, спалена, разрабавана звыш 12 тысяч вёсак і пасёлкаў. Вялікім горам стала вайна для нашай краіны і для кожнай беларускай сям'і.



Правообладатель Академия образования

?

1. Якія з пералічаных у вершы вобразаў паэт называе Белай Руссю?
2. Прачытайце наступныя радкі з верша. Каго меў на ўвазе аўтар, калі іх пісаў?

   *Дзе хлебам і соллю сяброў сустракаюць*
   *І з песняй праводзяць, як родных сваіх!..*

3. Што новага вы даведаліся з верша пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны?
4. Патлумачце значэнне слова «чыстая» ў адносінах да Беларусі.
5. У якіх радках верша выказана асноўная думка?
6. Як патрэбна чытаць гэты твор: хутка, працяжна, весела, з сумам? Чаму вы так думаеце?
7. Вывучыце верш на памяць і паўдзельнічайце ў конкурсе на лепшага чытальніка гэтага твора.
8. Паразважайце, што для вас з'яўляецца вобразам Беларусі. За што вы любіце нашу Радзіму? Раскажыце пра гэта.

**Творчае заданне.** Уявіце, што па змесце верша вы ствараеце кадры кінафільма/мультфільма. Апішыце кожны кадр: месца дзеяння, персанажаў, карціны прыроды.

***У свеце прыгожага***

На словы Уладзіміра Карызны кампазітар Юрый Семяняка напісаў музыку. Паслухайце песню і выкажыце свае ўражанні.

**Маўленчая размінка.** Прачытайце ўрывак з верша «Родныя з'явы» Міхася Пазнякова. Вымаўляйце правільна гукі [р], [дз'], [ц'], [ч] і падоўжаны [л'], спалучэнне [шч].

Тут Дняпро бяжыць прывольна,
Сож, Бярэзіна, Дзвіна,
Прыпяць, **Шчара**, Свіслач, Нёман,
Вілля, Піна, Буг, Дзісна.

**Успомніце.** Прачытайце загаловак апавядання. Пра што, на вашу думку, яно напісана? Што вы ведаеце пра Беларусь з урокаў літаратурнага чытання і вучэбнага прадмета «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь»?

**Спрадве́ку** — з даўніх пор.
**Адры́нуць** — адысці назад, адступіць.

## Лю́бая мая Беларусь!

*(Скарочана)*

*Паводле Янкі Сіпакова*



Любая Радзіма! Вельмі шаноўная мая Беларусь! Маці наша родная — усіх нас разам і кожнага паасобку! Нізка схіляюся перад табою ў пашане ўжо толькі за тое, што ты заўсёды была, заўсёды ёсць і заўсёды будзеш. Твае палі — самыя хлебада́йныя, твае лугі — самыя духмяныя, твае аблокі — самыя



Правообладатель Академия образования